## НАУЧНЫЕ МЕРОПРИЯТИЯ КАФЕДРЫ АРХЕОЛОГИИ И СПЕЦИАЛЬНЫХ ИСТОРИЧЕСКИХ ДИСЦИПЛИН ИСТОРИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА В 2022 г.

## НАВУКОВЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ КАФЕДРЫ АРХЕАЛОГІІ І СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА Ў 2022 г.

## SCIENTIFIC EVENTS AT THE DEPARTMENT OF ARCHAEOLOGY AND SPECIAL HISTORICAL DISCIPLINES OF THE FACULTY OF HISTORY OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY IN 2022

Кафедра археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта арганізавала два навуковыя мерапрыемствы ў 2022 г.

Міжнародная навуковая канферэнцыя «Археалогія Беларусі і сумежных тэрыторый: людзі і рэчы» на гістарычным факультэце вядучага ўніверсітэта краіны адбылася 5–7 кастрычніка 2022 г. У пленарным і секцыйных пасяджэннях прынялі ўдзел каля 80 прадстаўнікоў айчынных і замежных навуковых, адукацыйных і музейных устаноў. Сярод іх супрацоўнікі і аспіранты БДУ, Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсіэта імя Аркадзя Куляшова, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, Інстытута археалогіі Расійскай акадэміі навук, Дзяржаўнага Эрмітажа (Расія) і інш. Для маладых даследчыкаў, якія толькі пачынаюць свой шлях у навуцы, была арганізавана асобная студэнцкая секцыя. Канферэнцыя праходзіла ў вочным фармаце, аднак была прадугледжана магчымасць і дыстанцыйнага ўдзелу пры дапамозе платформы *Skype for business*.

Праца канферэнцыі пачалася з прывітальнага слова дэкана гістарычнага факультэта доктара гістарычных навук, прафесара А. Г. Каханоўскага. Ён ахарактарызаваў апошнія дасягненні ўніверсітэцкай археалогіі, акрэсліў яе задачы і перспектывы. На пленарным пасяджэнні прагучалі даклады, якія асвятлялі вынікі грунтоўных даследаванняў помнікаў каменнага – бронзавага вякоў на поўдні Беларусі (А. Г. Калечыц, М. М. Крывальцэвіч), а таксама раскрывалі малавядомыя старонкі гісторыі беларускай археалогіі XX ст. (А. У. Вайтовіч, В. І. Шадыра).

Ранішняе секцыйнае пасяджэнне першага дня канферэнцыі было прысвечана археалогіі каменнага і бронзавага вякоў. Былі заслуханы разнапланавыя даклады, якія ўводзілі ў навуковы абарот новыя даныя па актуальных праблемах першабытнай археалогіі. К. А. Барысевіч прадставіла агляд неалітычных матэрыялаў Паўночнага Прыільмення і Верхняга Паволхаўя. А. М. Вашанаў прапанаваў альтэрнатыўны падыход да вылучэння кудлаеўскай культуры. М. І. Ткачова азнаёміла слухачоў з сучасным станам даследавання праблемы паходжання керамікі на тэрыторыі Беларускага Пасожжа. Цікавасць удзельнікаў выклікаў калектыўны даклад Д. І. Цвіркі, М. М. Крывальцэвіча, П. Кіцеля

і Т. В. Якубоўскай, прысвечаны палеаэкалагічным умовам функцыянавання супольнасцей неаліту – бронзавага веку на тэрыторыі помніка Какорыца-4 у Заходнім Палессі.

Тэматыка другой секцыі ахоплівала шырокае кола пытанняў па вывучэнні археалагічных артэфактаў. А. А. Чубур прааналізаваў праблему ідэнтыфікацыі і інтэрпрэтацыі картападобных артэфактаў палеалітычнага часу з тэрыторыі Верхняга Падняпроўя. К. А. Кашына і М. М. Чарняўскі ў сваім сумесным дакладзе агучылі асноўныя вынікі даследавання антрапаморфных выяў на кераміцы перыяду неаліту – бронзавага веку лясной зоны Паўночна-Усходняй Еўропы. Даследчыкі разгледзелі як змест і стылістыку выяў, так і асаблівасці тэхнікі, у якой былі выкананы творы першабытнага мастацтва. Два выступленні былі прысвечаны методыцы вывучэння старажытных прылад працы і зброі. С. С. Велент-Шчэрбач раскрыла асобныя аспекты трасалагічнага аналізу крамянёвых пласцін з помнікаў Верхняга Панямоння. С. Б. Ліневіч акрэсліў праблемы апісання марфалогіі каменных свідраваных сякер. Асобны блок дакладаў прадэманстраваў напрацоўкі даследчыкаў у галіне аналізу артэфактаў пазнейшых эпох. М. А. Дорах засяродзіўся на магчымасцях прымянення гісторыка-культурнага падыходу да вывучэння марфалогіі керамічнага посуду з гродзенскага Старога замка. У цэнтры ўвагі К. А. Кухаравай знаходзілася гістарыяграфія вывучэння шкляных бранзалетаў старажытнарускага часу. Паведамленне М. В. Клімава закранала праблемы выкарыстання археалагічных знаходак у якасці гістарычнай крыніцы. Разглядаючы парахаўніцу з крэпасці Сокал, даследчык не абмежаваўся апісаннем умоў выяўлення знаходкі і рэканструкцыяй яе першапачатковага знешняга выгляду, але прапанаваў сваю трактоўку падзей 1579 г., у выніку якіх каштоўны прадмет мог быць страчаны. З грунтоўным дакладам, прысвечаным пытанням ідэнтыфікацыі і атрыбуцыі артэфактаў Навейшага часу, выступіў В. І. Кошман.

Ранішняе секцыйнае пасяджэнне другога дня канферэнцыі было прысвечана археалогіі Сярэднявякоўя і постсярэднявякоўя. У шэрагу дакладаў былі рэзюміраваны вынікі даследаванняў пахаванняў і асобных катэгорый пахавальнага інвентару VIII–XI стст. В. М. Тарасевіч прапанавала рэканструкцыю жаночага ювелірнага ўбору з грунтовага некропаля Наўры II. П. С. Курловіч распавяла аб асноўных аспектах вывучэння кургана № 1 курганнай групы № 2 археалагічнага комплексу Рэчкі. А. В. Вайцяховіч зрабіў даклад аб курганных старажытнасцях вярхоўяў Бярэзіны (Дняпроўскай). В. А. Дрэвіла прааналізавала матэрыялы могільніка Каласы, атрыманыя экспедыцыяй БДУ ў 1984 г. В. А. Макоўская прадставіла новыя звесткі аб курганным могільніку Камена-1. Пахаванні позняга Сярэднявякоўя – ранняга Новага часу з храмаў Паўночнай Беларусі разгледзеў В. У. Чараўко. Вялікую цікавасць у прысутных выклікаў даклад В. С. Крумплеўскага аб вопыце стварэння фармалізаванай базы прымет пахавальнага абраду. Падчас пасяджэння былі заслуханы і абмеркаваны паведамленні аб магчымасці распрацоўкі мадэлей кавальскай вытворчасці ў Полацкім і Разанскім княствах (У. І. Заўялаў, Н. М. Церахава) і аб арганізацыі сістэм водазабеспячэння ў гарадах Беларусі XI–XVII стст. (Л. У. Калядзінскі). Не засталася па-за ўвагай удзельнікаў канферэнцыі і праблематыка гісторыі навукі. В. В. Бегунова распавяла аб унёску В. Р. Тарасенкі ў археалагічнае вывучэнне Смаленшчыны ў 1920-я гг.

Вячэрняя секцыя была прысвечана археалогіі жалезнага веку. Два выступленні закранալі пытанні вывучэння гарадзішчаў. М. І. Лашанкоў разгледзеў знаходкі ранняга жалезнага веку з Банцараўскага гарадзішча, Т. С. Бубенька прадставіла вынікі даследаванняў найбольш старажытных умацаваных паселішчаў Віцебскага Падзвіння. Праблемы рэстаўрацыі і кансервацыі знаходак абмяркоўваліся ў калектыўным дакладзе, агучаным Л. С. Варацінскай і А. І. Драбушэўскім. Даследчыкі падзяліліся вопытам захавання і экспанавання археалагічных знаходак з зарубінецкага могільніка Гарошкаў.

Некалькі дакладаў былі падрыхтаваны па выніках вывучэння асобных катэгорый рэчаў ранняга жалезнага веку і рымскага часу. А. Д. Сахончык і Д. І. Ліндзянкоў распавялі аб скарбе жалезнага веку, які быў выяўлены каля вёскі Першамайск у Лоеўскім раёне. Г. М. Бяліцкая прадставіла рэчавыя знаходкі перыяду рымскіх уплываў з басейна ніжняй плыні Гарыні. Н. М. Дубіцкая прааналізавала вырабы з гліны, знойдзеныя на помніках культуры Абідня. У. А. Лучшава прадэманстравала магчымасці і абмежаванні выкарыстання шыйных упрыгожанняў вельбарскай культуры ў якасці маркёра культурных сувязей насельніцтва.

У апошні дзень працы канферэнцыі адбылося пасяджэнне студэнцкай секцыі. Тэматыка дакладаў маладых даследчыкаў была вельмі шырокай. Выступоўцы разгледзелі гісторыю вывучэння шэрагу помнікаў і археалагічных культур (Д. А. Атрохаў, К. А. Рогач, Я. А. Сілуянаў), вызначылі сучасны стан даследавання асобных катэгорый прадметаў, што датуюцца жалезным векам (М. П. Семіжон), Сярэднявякоўем (В. А. Есіс) і Новым часам (П. Г. Вацура, Д. М. Ісакава).

Падводзячы вынікі канферэнцыі, удзельнікі высока ацанілі праслуханыя даклады. Было адзначана, што навуковае мерапрыемства аб'яднала прадстаўнікоў розных даследчых школ і напрамкаў. Плён такога супрацоўніцтва дазваляе разлічваць на далейшае паспяховае ўкараненне новых метадаў і тэхналогій у беларускую археалагічную навуку. Высокую ацэнку атрымала практыка арганізацыі адмысловай дыскусійнай пляцоўкі для студэнтаў. Перспектыва канструктыўнага абмеркавання напрацовак на навуковым форуме павінна заахвочваць моладзь да самастойнай даследчай дзейнасці.

На гістарычным факультэце БДУ 2 снежня 2022 г. быў праведзены Рэспубліканскі круглы стол памяці доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Андрэевіча Егарэйчанкі – вядомага навукоўцы, які на працягу амаль чвэрці стагоддзя ўзначальваў

кафедру археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел супрацоўнікі БДУ, Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і іншых навуковых устаноў. На пасяджэнні быў заслуханы шэраг дакладаў, прысвечаных розным аспектам творчага шляху А. А. Егарэйчанкі.

Цікавасць удзельнікаў выклікалі выступленні Ю. П. Латушковай і М. В. Клімава. Выпускнікі гістарычнага факультэта БДУ падзяліліся з прысутнымі сваімі ўспамінамі аб студэнцкіх археалагічных практыках, якія праходзілі пад кіраўніцтвам А. А. Егарэйчанкі ў 1990-я гг. У той час навуковец праводзіў даследаванні гарадзішчаў жалезнага веку на тэрыторыі Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі. Яго экспедыцыі станавіліся сапраўдным выпрабаваннем для многіх першакурснікаў. Лагер размяшчаўся за 5 км ад раскопак, начаваць даводзілася ў вясковых школах і брызентавых намётах, а жыццё было падпарадкавана суроваму распарадку, выкананне якога надзвычай жорстка пільнаваў Аляксандр Андрэевіч. Абодва дакладчыкі з удзячнасцю ўзгадалі своеасаблівы падыход даследчыка да падрыхтоўкі лабарантаў: ён ставіў перад студэнтамі складаныя задачы і дабіваўся амаль бездакорнага іх рашэння, пры гэтым сам стараўся не даваць парад і падказак.

А. У. Любы закрануў важныя тэмы фарміравання нацыянальнага гістарычнага наратыву і ролі археолагаў у падрыхтоўцы ўніверсітэцкіх дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. Выступоўца вылучыў два пакаленні вучэбнай літаратуры, прысвечанай старажытнаму перыяду гісторыі нашай краіны. Першае пакаленне падручнікаў (нацыяцэнтрычнае) убачыла свет у 1990-я гг. Наступны этап асэнсавання мінулага, звязаны з выкладаннем гісторыі Беларусі ў еўрапейскім ці сусветным кантэксце (так званы цывілізацыйны падыход), распачаўся ўжо ў новым тысячагоддзі. У гэты час выходзяць падручнікі другога пакалення. Дакладчык адзначыў, што ў канцы 2000-х гг. да працы па напісанні падручнікаў для вышэйшай школы далучыўся А. А. Егарэйчанка. Вядомы археолаг лічыў неабходным разглядаць ва ўніверсітэцкім курсе такія пытанні, як этнічная прыналежнасць супольнасцей жалезнага веку, кантакты старажытных груп насельніцтва і інш.

Асобны блок дакладаў уключаў разгляд праблем, якія ўваходзілі ў кола навуковых інтарэсаў А. А. Егарэйчанкі, аўтарытэтнага спецыяліста ў галіне археалогіі позняга бронзавага і жалезнага вякоў Беларусі. М. М. Крывальцэвіч азнаёміў слухачоў з сучасным станам і перспектывамі вывучэння позняга перыяду эпохі бронзы ва Усходнім Палессі. А. Д. Сахончык акрэсліў ключавыя напрамкі даследавання помнікаў позняга бронзавага і ранняга жалезнага вякоў з Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі. В. І. Шадыра прысвяціў сваё выступленне Браслаўскаму Паазер'ю як памежнай зоне культур ранняга жалезнага веку. С. Б. Ліневіч прадставіў вынікі тыпалагічнага і культурна-храналагічнага аналізу каменнага арнаментаванага молата з калекцыі Столінскага раённага краязнаўчага музея.

Дакладчыкі, аддаючы даніну павагі ўнёску А. А. Егарэйчанкі ў вывучэнне археалогіі Беларусі, сфармулявалі найбольш актуальныя праблемы, якія сёння стаяць перад беларускай навуковай супольнасцю. Надзённымі задачамі з'яўляюцца пашырэнне крыніцазнаўчай базы і ўдасканаленне метадалагічнага апарату даследавання. Спецыялістам неабходна скіраваць увагу на распрацоўку мікрарэгіянальных перыядызацыйных схем і дэталёвы таксанамічны падзел матэрыялаў. У прыярытэце павінны знаходзіцца міждысцыплінарныя праекты.

Падчас працы круглага стала на гістарычным факультэце БДУ дзейнічала выстава асноўных публікацый А. А. Егарэйчанкі, арганізаваная супрацоўнікамі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Па выніках выстаўкі спецыялістамі бібліятэкі быў падрыхтаваны буклет біябібліяграфічнага характару[1].

Такім чынам, навуковыя мерапрыемствы, праведзеныя кафедрай археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ восенню – зімой 2022 г., выклікалі шырокі рэзананс сярод даследчыкаў. Па аднадушным меркаванні ўдзельнікаў, і канферэнцыя, і круглы стол прайшлі на высокім узроўні. Запланаваная публікацыя зборніка дакладаў стане важнай падзеяй у навуковым жыцці Беларусі.

***А. У. Вайтовіч*[2], *П. С. Курловіч*[3]**

[1]Памяці вучонага А. А. Егарэйчанкі [Электронны рэсурс]. URL: https://csl.bas-net.by/pdf/2022/12/egareychanka-buklet.pdf (дата звароту: 10.12.2022).

[2]*Александра Владимировна Вайтович* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандра Уладзіміраўна Вайтовіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aliaksandra V. Vaitovich*, PhD (history), docent; associate professor at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *vaitovich.aliaksandra@gmail.com*

[3]*Полина Сергеевна Курлович* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Паліна Сяргееўна Курловіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Palina S. Kurlovich*, PhD (history), docent; head of the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *kurlovichp@bsu.by*